Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь
Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь

запрашае прыняць удзел у

# XXIII Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі "АЛАДАЎСКІЯ ЧЫТАННІ – 2025", прысвечанай 80-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941-1945 гг.

Канферэнцыя адбудзецца 22 мая 2025 года
па адрасе: г. Мінск, вул. Леніна, 20

На канферэнцыі прапануюцца да абмеркавання наступныя тэмы:

• Музей і яго збор, праблемы і практыкі калекцыянавання.
• Музей і Вялікая Айчынная вайна 1941–1945 гг.: гісторыя музея і бытаванне яго калекцый.
• Актуальныя тэндэнцыі ў галіне сучаснага выяўленчага мастацтва.
• Вялікая Айчынная вайна 1941–1945 гг. у творах выяўленчага мастацтва.
• Атрыбуцыя і навуковыя даследаванні твораў мастацтва з музейных калекцый.
• Практычны вопыт і гістарычная перспектыва рэстаўрацыі музейных прадметаў.
• Сучасныя магчымасці музейнай камунікацыі.
• Тэорыя і практыка музейнага менеджменту і маркетынгу.
• Музейная педагогіка праз прызму сучасных методык і тэхналогій.
• Інклюзія ў музейнай сферы.

У 2025 годзе апрабуецца тэматычнае пашырэнне, звязанае з міждысцыплінарнасцю і культурна-сацыяльным кантэкстам музейнай дзейнасці, такія тэматычныя напрамкі:

• Філасофія куратарства.
• Музеялогія, музеязнаўства, музейная справа.

• Музей як тэкст, яго вытворчасць і інтэрпрэтацыя.
• Музей і соцыум, рэпрэзентатыўнасць нацыянальнага.
• Музей і час: спадчынна, рэалізуемае, будучыня.

Да ўдзелу ў канферэнцыі запрашаюцца мастацтвазнаўцы, музеязнаўцы, рэстаўратары, гісторыкі, культуролагі і прадстаўнікі сумежных дысцыплін, якія разглядаюць магчымасць інфармаваць грамадскасць аб сваіх прафесійных напрацоўках.

**Рэгламент канферэнцыі**:

Даклады – да 15 хвілін, выступы і паведамленні ў дыскусіях – да 5 хвілін. Мовы канферэнцыі: беларуская, руская. Форма правядзення: вочная.

**Заяўку** на ўдзел (па прыкладаемай форме) і **тэкст даклада** з паметкай «*Аладаўскія чытанні*» неабходна даслаць па электроннай пошце *conference@artmuseum.by* не пазней за **11 мая 2025 г**.

Па выніках работы канферэнцыі плануецца выданне **зборніка навуковых артыкулаў. Аргкамітэт пакідае за сабой права адбору матэрыялаў для публікацыі ў зборніку.** Публікацыя адабраных матэрыялаў бясплатная. Тэкст артыкула павінен быць добра вывераны, набраны ў адпаведнасці з пазначанымі ніжэй патрабаваннямі.

**Пры афармленні дакладаў просім прытрымлівацца наступных патрабаванняў:**

• Тэкставы рэдактар Microsoft Word, шрыфт Times New Roman (14 кегель у асноўным тэксце, 12 кегель для бібліяграфічнага спісу).
• Аб'ём да 15 000 знакаў.
• У першым шэрагу справа паказваюцца прозвішча і ініцыялы аўтара, у дужках - краіна, горад. Назва артыкула даецца праз радок вялікімі літарамі, выраўноўванне - па цэнтры, тоўсты шрыфт. Асноўны тэкст размяшчаецца праз радок ад назвы.
• Дакумент захоўваецца ў фармаце **docx** ці **rtf**. Назва файла - прозвішча аўтара, напрыклад, Іваноў.артыкул.docx.
• Палі: левае - 3 см, астатнія - 2 см; абзацны водступ - 1,25 см (не выкарыстоўваць табуляцыю і прабелы); міжрадковы інтэрвал - 1,0; выраўноўванне па шырыні старонкі; арыентацыя ліста - кніжная.
• Зноскі **забаронены**. У тэксце літаратура абазначаецца квадратнымі дужкамі з указаннем у іх парадкавага нумара крыніцы па спісе і праз коску – нумары старонкі (старонак), напрыклад: : [5, с. 115].

• У канцы тэксту літаратура афармляецца пад назвай “Спіс выкарыстанай літаратуры” і ў адпаведнасці з патрабаваннямі ВАК РБ (*https://vak.gov.by/bibliographicDescription*).
• **Крыніцы даюцца ў алфавітным парадку. Не дапускаецца ўключаць у спіс літаратуры крыніцы, на якія адсутнічаюць спасылкі ў тэксце артыкула**. Усе выкарыстоўваныя ў тэксце двукоссі друкарскія «», унутры цытат звычайныя “”. Выкарыстанне злучка замест працяжніка не дазваляецца.
• У тэкст дакладу могуць быць уключаныя ілюстрацыі (фармат jpg ці tif з дазволам не менш за 300 dpi). **Ілюстрацыі павінны быць уключаны ў тэкст**, а таксама **абавязкова прадубліраваны** асобнымі файламі. Подпісы да ілюстрацый таксама дасылаюцца асобным спісам.
• Агульны аб'ём графічных дадаткаў не больш за 7 файлаў.
• Кожная табліца або малюнак павінны быць згаданы ў тэксце і мець назву (для табліц) або подпіс (для малюнкаў). Нумарацыя даецца па парадку размяшчэння ў артыкуле. У тэксце ўказанне нумара малюнка або табліцы змяшчаецца ў круглых дужках – (мал. 1).

Аргкамітэт пакідае за сабой права адбору для друку дасланых матэрыялаў, у тым ліку:
– якія не адпавядаюць тэматыцы або не адпавядаюць узроўню канферэнцый міжнароднага фармату;
- аформленых з парушэннем патрабаванняў.

Атрыманне матэрыялаў па электроннай пошце будзе пацверджана аргкамітэтам. У выпадку неатрымання ліста ў адказ (з паведамленнем аб прыняцці заяўкі да разгляду) на працягу тыдня просім прадубліраваць Вашу заяўку яшчэ раз па электронным адрасе: conference@artmuseum.by.

**Афіцыйнае персанальнае запрашэнне** на канферэнцыю **дасылаецца па запыце (для афармлення камандзіроўкі).**
Аргкамітэт не мае магчымасці аплаціць удзельнікам канферэнцыі камандзіровачныя выдаткі. Праезд, пражыванне і харчаванне ажыццяўляюцца ўдзельнікамі канферэнцыі за кошт накіроўваючага боку.

**Прыклад афармлення артыкула**:

**Афармленне артыкула**: Прозвішча і ініцыялы аўтара, у дужках краіна і горад - выраўноўванне па правым краі. На наступным радку вялікімі літарамі назва артыкула. Праз радок - тэкст артыкула. У канцы артыкула - спіс выкарыстанай літаратуры.

Іваноў І.І. (Рэспубліка Беларусь, г. Мінск)

**АТРЫБУЦЫЯ КАРЦІНЫ СА ЗБОРУ НАЦЫЯНАЛЬНАГА МАСТАЦКАГА МУЗЕЯ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

Тэкст.

Спіс выкарыстанай літаратуры

**Кантактныя асобы:**

*Для заявак:*

*Янкоўская Анжаліка Уладзіміраўна, вучоны сакратар, тэл.: +375 17 347 95 55;*

*Шантар Дзіяна Георгіеўна, загадчык аддзела навукова-асветніцкай работы і маркетынгу, тэл.: +375 17 342 87 87.* E-mail: conference@artmuseum.by

*Для артыкулаў:*

*Круглікава Ірына Аляксандраўна, вядучы рэдактар рэдакцыйна-выдавецкага аддзела, тэл. +375 17 365 28 42;* E-mail: retumikon@artmuseum.by

З павагай,
аргкамітэт канферэнцыі

**Заяўка**
**на ўдзел у XXIII Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі**
**«АЛАДАЎСКІЯ ЧЫТАННІ - 2025»**

**22 мая 2025 г.**

| | |
|---|---|
| Прозвішча, імя, імя па бацьку | |
| Вучонае званне, вучоная ступень (пры наяўнасці) | |
| Месца працы/вучобы | |
| Пасада | |
| Адрас (па месцы працы/вучобы) | |
| Тэлефон, эл. пошта | |

| | |
|---|---|
| Назва даклада | |
| Выкарыстанне тэхнічных сродкаў (пазначыць якіх) | |
| Электронны варыянт афіцыйнага запрашэння (для афармлення камандзіроўкі) (так, не) | |